## МІНСКІ ВАЛЬС

муз. М.Шуміліна　　　　　　　　сл. Дзеружынскага




Горад наш любімы, горад сэрцу мілы,
Зноў ты нарадзіўся і няспынна рос,
Прыгажэў з гадамі, набіраўся сілы
І высока ўзняўся ў сіняву нябёс.

У садах і скверах, і на плошчах летам
Добра быць з табою у вячэрні час.
Нам даносіць вецер пах ліпнёвых кветак,
Песні загучалі і ляцяць да нас.

Хораша наўкола, сэрца весяліцца,
Тут нам жыць і марыць, праз гады ісці
Разцвітай жа, наша родная сталіца!
Мінск – любімы горад, слаўся і расці!